УДК 811.161.3(075.2)

***А.У. Кунічык***
*ДУА «Зарэцкая сярэдняя школа»*
*Зарэчча Рэчыцкага раёна, Рэспубліка Беларусь*
***К.С. Сідарок***
*ДУА «Брагінская сярэдняя школа»*
*Брагін, Рэспубліка Беларусь*
***А.В. Солахаў***
*УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна»*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМУ «ЗНАЁМЫЯ НЕЗНАЁМЦЫ» Ў НАВУЧАННІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ УМЕННЮ ПІСАЦЬ КАЗКІ

*Аннотация. В статье описывается методика работы младших школьников по созданию сказок на уроках белорусского языка и литературного чтения с использованием приёма «Знакомые незнакомцы». Содержатся примеры сказок, написанных учащимися 3 «Д» класса СШ № 9 г. Мозыря.*

*Ключевые слова: сочинение-сказка, подготовительный этап, основной этап, прыём работы, беседа.*

***A.V. Konichek***
*Zarechye high school*
*Zarechye, Rechitsa district, Republic of Belarus*
***K.S. Sidarok***
*Bragin high school*
*Bragin, Republic of Belarus*
***A.V. Solakhau***
*Mozyr state pedagogical University named after I. P. Shamyakin*
*Mozyr, Republic of Belarus*

# USING THE «FAMILIAR STRANGERS» METHOD IN TEACHING PRIMARY SCHOOL CHILDREN THE ABILITY TO WRITE FAIRY TALES

*Abstract. The article describes the method of work of primary school children on writing fairy tales in the Belarusian language lessons and literary reading using the «Familiar strangers» technique. Examples of fairy tales written by students of the 3rd «D» class of school No. 9 in Mozyr are given.*

*Keyword: essay-fairy tale, preparatory stage, main stage, reception of work, conversation.*

Няма такога дзіцяці, якое б не любіла слухаць казкі. Многія дзеці, навучыўшыся чытаць, звяртаюцца да казак. Улічваючы жаданне тварыць, ствараць, малодшых школьнікаў можна вучыць складаць свае казкі.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Сачыненне-казка – творчая праца вучняў пра выдуманыя падзеі, з’явы, герояў, нярэдка з удзелам чараўніцтва.

Складаць казку – значыць уключаць творчае мысленне, фантазію, ствараць незвычайны казачны свет. Праца над сачыненнем-казкай дапамагае фарміраваць у дзяцей дабрыню, справядлівасць, адвагу і іншыя маральныя якасці.

З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца розныя прыёмы працы. Усе яны, у той або іншай меры, садзейнічаюць развіццю фантазіі, творчых здольнасцей, а таксама ўвагі і ўспрымання, павышэння камунікатыўных і маральных якасцей.

Адзін з такіх прыёмаў – «Знаёмыя незнаёмцы».

Гэты прыём мае 2 этапы правядзення:

– падрыхтоўчы;

– асноўны.

Падрыхтоўчы этап заключаецца ў тым, каб вучні спачатку ўспомнілі пра тое, што такое казка, і расказалі змест вядомай ім казкі.

Для гэтага мы выкарысталі прыём «Узнаві казку». Вучням паведамілі, што канцы слоў з казкі зніклі, і папрасілі дапамагчы аднавіць яе.

*– Жы..-бы.. Дзе.. і Ба.. . І бы.. ў і.. ку.. Ра.. . Зня.. ку.. яе.., ды не про.., а за.. . Дзе.. бі..-бі.. – не раз.., Ба.. бі..-бі.. – не раз.. . Пакла.. Дзе.. яе.. на па.. . Мы.. бе.., хво.. ма.., яе.. ўпа.. і раз.. . Пла.. Дзе.., пла.. Ба.., а ку.. куда..: – Не пла.., Дзе.., не пла.., Ба.. . Зня.. я яе.., ды не за.., а про.. .*

Тэкст, які складаецца толькі з першых частак слоў, настаўнік не чытае, а расказвае. Пасля чытання актыўнасць дзяцей узрастае: кожны хоча аднавіць казку.

Пасля некалькіх пераказаў казкі вучнямі настаўнік прапануе запісаць на дошцы імёны герояў казкі, акрамя мышкі. З’яўляецца запіс: *Дзед, Баба, курка Раба*. Настаўнік прапануе дапісаць у героі казкі Бусла і прыдумаць на гэтым грунце новую казку.

Настаўнік прапануе дзецям назваць герояў, запісаных на дошцы, і даць ім характарыстыку. Каб дапамагчы вучням, праводзіць невялікую гутарку па наступных пытаннях:

*– З якой казкі дадзеныя героі? (Казка «Курачка Рабка»).*

*– Якім вы ўяўляеце сабе Дзеда? (Бабу, курку Рабку, яечка, Бусла?)*

*– Дзе могуць адбывацца падзеі? (У хаце, у садзе, на двары.)*

Пасля гэтага пераходзім да асноўнага этапу, які заключаецца ў непасрэдным напісанні казак вучнямі.

Разгледзім найбольш яркія прыклады прац, выкананыя вучнямі 3 «Д» класа СШ № 9 г. Мазыра.

1. *Жылі-былі Дзед і Баба. Была ў іх курачка Раба. Аднойчы знесла курачка яечка, ды не прастое, а залатое. Дзед біў-біў – не разбіў. Баба біла-біла – не разбіла. Пралятаў міма хаты Бусел, і раптам убачыў ён на падаконніку залатое яечка. Вырашыў Бусел яго ўкрасці: заляцеў у акно, схапіў яечка і, вылятаючы з акна, зачапіўся за шторку. Яечка выпала з дзюбы Бусла і разбілася.*

*Плача Дзед, плача Баба.*

*Падбегла курка да Дзеда з Бабкай і кажа: «Не плачце, я знясу вам другое яечка, не залатое, а прастое».* (Аляксандра Нічыпорка.)

*2. Жылі-былі Дзед і Баба. Была ў іх курка Раба. Знесла курка яечка, ды не простае, а залатое. Дзед і Баба здзівіліся незвычайнаму яечку і вырашылі яго разбіць. Дзед біў-біў — не разбіў, Баба біла-біла — не разбіла. Тады вырашылі яны паспрабаваць разбіць яечка на наступны дзень. Паклалі Дзед з Бабай яечка на стол, які стаяў у садзе, і пайшлі ў хату.*

*Недалёка ад гэтага саду было балота, у якім Бусел шукаў сабе ежу. Не знайшоўшы нічога, засмучаны Бусел узляцеў высока і ўбачыў залатое яечка. Не раздумваючы, ён паляцеў у сад. Падляцеў да стала і пачаў разглядаць яечка з усіх бакоў. «Ніколі я такога яечка не бачыў. Забяру яго сабе», – падумаў бусел.*

*Бусел паглядзеў па баках — нікога. Тады ён акуратна ўзяў яечка і толькі хацеў узляцець, як нечакана з хаты выйшлі Дзед і Баба. Бусел спалохаўся, кінуў яечка і паляцеў. Дзед з Бабай падбеглі да яечка і ўбачылі, што яно разбілася.*

*Плача Дзед, плача Баба, а курка кудахча: «Не плач, Дзед, не плач, Баба, я знясу для вас другое яечка, не залатое, а простае».* (Юлія Чырун.)

*3. Жыў-быў Дзед, жыла-была Бабка. Была ў іх прыгожая курка Рабка. У адзін з сонечных, цёплых дзён знесла курка яечка, ды не простае, а залатое. Дзед і Баба ад радасці не паверылі сваім вачам. Дзед біў-біў – не разбіў, Бабка біла-біла – не разбіла. Тады яны вырашылі пайсці спытаць щ суседзяў, як ім разбіць залатое яечка.*

*Тым часам пралятаў над іх хатай галодны Бусел. Заўважыў ён залатое яечка, падляцеў да яго. Разгледзеў бусел яечка з усіх бакоў і падумаў: калі яно залатое, то ім можна добра наесціся. Бусел дзеўбануў сваёй вялікай дзюбай у яечка, а яно і разбілася.*

*Прыйшлі Дзед з Бабкай. Убачылі яны Бусла каля яечка і прагналі яго. Падбеглі да яечка, а яно разбітае.*

*Плача Дзед, плача Бабка, а курка ім кажа: «Не плач, Дзед, не плач, Бабка, я знясу вам другое яечка, не залатое, а простае».* (Уладзіслаў Кудранок.)

*4. Жылі-былі Дзед і Бабка. Была ў іх курка Раба. Аднойчы знесла курка яечка – не простае, а залатое. Дзед біў-біў – не разбіў, Баба біла-біла – не разбіла. Селі яны на ганак і сталі думаць, як жа ім разбіць яечка.*

МГПУ им. И.П.Шамякина

*На даху адной з суседніх хат жыў Бусел. Пачуў ён пра залатое яечка, і стала яму вельмі цікава, што ж знаходзіцца ў сярэдзіне яечка. Бусел вырашыў падабрацца да залатога яечка тады, калі нікога не будзе побач. Надышоў той момант, калі Дзед і Бабка пайшлі ў хату.*

*Бусел, доўга не разважаючы, падляцеў да яечка і закрануў яго. Яечка звалілася на зямлю і разбілася. Спалохаўся Бусел і паляцеў. Дзед з Бабкай пачулі шум, выбеглі на вуліцу і ўбачылі толькі разбітае яечка.*

*Плача Дзед, плача Бабка, а курка кудахча: «Не плач, Дзед, не плач, Бабка, я знясу вам зусім іншае яечка, не залатое, а простае».* (Аліна Цалка.)

Прыведзеныя вышэй казкі паказваюць, што большасць вучняў напісала цікавыя казкі, практычна без памылак. Паслядоўнасць падзей у казках адпавядае структуры твораў. Дзеці знайшлі розныя прычыны, каб Бусел разбіў яечка, і падрабязна гэта апісалі.

Але не ўсе вучні паспяхова справіліся з заданнем: сюжэт іх казак неразвіты, у тэкстах шмат рускіх слоў і арфаграфічных памылак. Напрыклад:

*1. Жыў-быў дзед да баба і ўних была курка Раба. Знесла курка Раба залатое яічка. Дзед біў-біў – не разбіў, баба біла-біла – не разбіла. Бусел ляцел і зачапіў яічка яно разбілася. Плача дзед, плача баба. Не плач дзед, не плач баба, я вам новае знясу.*

***Данііл Л.***

*2. Жыў-быў дзед да баба і была ў іх курачка Раба. Снесла курачка яечка не прастое а залатое. Дзед біў-біў – не разбіў, баба біла-біла – не разбіла. Пралящел бусел, крылом махнуў, яечка ўпала ды разбілася. Квохча курачка не плач дзед не плач баба снясу я вам не залатое яечка, а звычайнае. Бо бусел зноў яго разаб'е!*

***Цімафей К.***

*3. Жылі-былі дзед і баба і была ў іх курачка Раба. Знесла курка Раба залатое яечка. Дзед біў-біў яечка – не разбіў, баба біла-біла – не разбіла. раптам заляцеў бусел у атчыненае акно і дзяўбануў яечка. Плача дзед, плача баба а курачка не плача.*

***Яраслаў Л.***

Як правіла, хуткасць чытання ў такіх дзяцей ніжэйшая, чым у астатніх, і пішуць яны больш марудна. Але праца па стварэнні казак ім таксама падабаецца. Значыць, ёсць матывацыя да навучальнай дзейнасці, якая ў далейшым павінна даць і належны плён.

Такім чынам, выкарыстанне прыёму «Знаёмыя незнаёмцы» пры напісанні сачыненняў-казак не толькі павялічвае пазнавальную цікавасць і матывацыю да навучальнай дзейнасці, але і падахвочвае вучняў аналізаваць, разважаць, рабіць высновы.

МГПУ им. И.П.Шамякина